Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.
Родная газета на роднай мове
# ЗВЯЗДА
№ 80 (28696)
27 КРАСАВІКА 2018 г.
ПЯТНІЦА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

9-24 стар. МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ
+TV ПРАГРАМА



**«Раны» на карце**

МС



**Вундэркінды і Георгій Калдун**

МС



**Каму належаць гаражы-міражы?**

МС

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Юрый СЯНЬКО, старшыня Дзяржаўнага мытнага камітэта Рэспублікі Беларусь:**

*«У першым квартале 2018 года беларускімі мытнікамі выпушчана каля 16,5 % экспартных дэкларацый на працягу 1-2 хвілін. Сёння аўтаматычны выпуск тавараў замацаваны па ініцыятыве беларускай мытні ў Мытным кодэксе Еўразійскага эканамічнага саюза».*

# «ПРЫГАЖОСЦІ ШМАТ НЕ БЫВАЕ!»



**...Кажа жыхарка Бабруйска Людміла ШЫЛОВІЧ — кветкавод-аматарка. Не першы год на невялікай клумбе пад вокнамі дзевяціпавярховага дома, у якім яна жыве, садзіць мноства самых розных відаў кветак. Не толькі для сябе — для суседзяў па пад'ездзе і ўсіх жыхароў шматпавярховіка стварае кветкавую прыгажосць. Болей за сотню найменняў кветак расце з вясны да восені на яе клумбе. Напрыклад, адных касачоў дзесяць найменняў, руж і таго болей — ажно дваццаць пяць кустоў, півоняў — восем сартоў, дзясяткі лекавых раслін...**

**— Яшчэ з зімы на балконе я прарошчваю насенне, а потым, як сонейка добра прагрэе глебу, перасаджваю расліны ў грунт, — кажа Людміла Шыловіч. — На захапленне кветкамі мяне натхніў ветэран вайны Барыс Мікалаевіч Музалеўскі, які жыве ў нашым доме і кожную вясну працуе над упарадкаваннем двара.**

**Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.**

■ Дыскусія

# ЯК ПАЛЕПШЫЦЬ ЖЫЦЦЁ ЛЮДЗЕЙ З АСАБЛІВАСЦЯМІ?

## Удасканаліць законы і перастаць бачыць у інваліднасці толькі медыцынскую праблему...

**Апошнім часам шмат гаворыцца пра праблемы людзей з інваліднасцю. І зразумела чаму — бо яны ёсць. Хоць мы не стаім на месцы і дзяржава стараецца абараняць правы гэтых людзей. Сёння нельга сказаць, што нашы законы ў чымсьці супярэчаць нормам Канвенцыі ААН аб правах інвалідаў. Але, напрыклад, канвенцыя ўстанаўлівае забарону ўсякай дыскрымінацыі па прыкмеце інваліднасці. Але што лічыць дыскрымінацыяй? У розных людзей на конт гэтага можа быць рознае меркаванне. Таму мы не пераадолеем яе, калі не канкрэтызуем, што ж гэта такое і якія ў яе прыкметы, і не прапішам гэта дакладна і зразумела ў законе. І гэта не адзінае пытанне, якое чакае ўдакладнення.**



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Таму дэпутаты Пастаяннай камісіі па працы і сацыяльных пытаннях Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі пачынаюць работу па падрыхтоўцы законапраекта **«Аб змяненні законаў па пытаннях сацыяльнай абароны інвалідаў»**. Нядаўна камісія правяла выязное пасяджэнне, на якое былі запрошаны прадстаўнікі самых розных міністэрстваў і ведамстваў, а таксама грамадскіх аб'яднанняў людзей з інваліднасцю. Яго мэтай было прагаварыць асноўныя болевыя пункты і пачуць канкрэтныя прапановы ўсіх зацікаўленых удзельнікаў.

Пытанняў для абмеркавання аказалася шмат. Напрыклад, на думку **намесніка міністра працы і сацыяльнай абароны Аляксандра РУМАКА**, нам трэба адрэгуляваць пытанні надання людзям з інваліднасцю права на ўдзел у культурным і спартыўным жыцці грамадства і выразна прапісаць гэта ў заканадаўстве.

СТАР. 4

## КАРАТКА

Працоўныя пенсіі ў Беларусі з 1 мая ў выніку пераразліку павялічацца ў сярэднім на 5,4 %. Гэта прадугледжана Указам № 142 «Аб павышэнні пенсій», які Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка падпісаў 26 красавіка.

**У Егіпце плануюць штрафаваць гандляроў, якія занадта назойліва прапануюць свой тавар на тэрыторыі турыстычных аб'ектаў або музеяў. Адзначаецца, што штраф складзе 10 000 егіпецкіх фунтаў (звыш $560). Дадзены штраф у два разы перавышае памер сярэдняга месячнага заробку ў Егіпце. Ініцыятыва закліканая надаць егіпецкаму турызму «цывілізаваны імідж».**

Юныя беларускія хакеісты саступілі камандзе Фінляндыі з лікам 2:5 (0:3, 1:2, 1:0) у плэй-оф чэмпіянату свету (U-18) у Расіі і завяршылі выступленне на турніры. Падапечныя Паўла Перапехіна выйшлі ў васьмёрку наймацнейшых каманд сусветнага форуму, гэта найбольш высокі вынік з ЧС-2002 года (5-е месца).

**Школьнік у навушніках трапіў пад цягнік у Добрушскім раёне. Інцыдэнт адбыўся 25 красавіка каля станцыі Насовічы. З рознымі траўмамі непаўналетні жыхар Добрушскага раёна 2002 г. н. быў дастаўлены ў рэанімацыю.**

ISSN 1990 - 763X